## Юлія Гайдукова



..А людзі? Што людзі?

Людзі скажуць: —Маладая! ...

**Маладая**

Сонца і неба,
Горы і рэкі
Сьпяваюць гімн маёй маладосьці.

Маёй маладосьці,
Маёй прыгажосьці,
Маёй ягамосьці.

Зямля — мая!
Аблокі — мае!
Усе кветкі — мае!
Усе скарбы — мае!

Хочацца сонца,
Гораў і рэкаў,
Хочацца ўсіх таямніцаў Сусьвету!

*Малюнкі*
*Ю. Гайдуковай.*



...І бегчы раніцай
Туманам,
Расой сьвітальнай,
Дурнап’янам,
Забыўшы пра строі,
Пра сорам дзявочы,
Пра матчыны словы...

А людзі?
Што людзі?
Людзі скажуць:
— Маладая!



* * *

Рэйкі — як рукі.
Шпалы — як шнары.
Ідуць цягнікі і грукочуць саставы.
Саставы ляцяць праз імгненьняў суставы
І цела нясуць маё не без падставы
Да нашай сустрэчы з табою.

Рэйкі — як рэкі.
Шпалы — як шалі.
Мільгаюць за вокнамі шпаркія здані.
А рукі ўжо мараць аб хуткім спатканьні,
І вусны ўжо трызьняць таемным жаданьнем,
—
Каб сэрца спатоліць спакоем.

* * *

Шэрыя дрэвы,
Шэрыя дахі,
Шэрыя лёсы.

Шэрыя думкі,
Шэрыяптахі,
Шэрая Восень.

Імгла.
Імжа.
Іржа.

